уплывалі нездавальняючая матэрыяльная база школ, востры недахоп педагагічных кадраў, пісьмовых прылад працы, адсутнасць у многіх педагогаў неабходнай падрыхтоўкі і г.д. Па гэтых прычынах першыя гады пасля вайны паказалі даволі слабую паспяховасць у значнай частцы вучняў.

**Літаратура**

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф.2797, воп.1, с.4.

2. Котаў А.І. Аднаўленне і развіццё агульнаадукацыйнай школы ў пасляваеннай беларускай вёсцы (1944-1960)// Веснік БДУ. Сер.3.1998. №1.

3. Культурное строительство в Белорусской ССР (1946-1958)- Мн.,1979.

4. ДАВВ. Ф.2797, воп.1, с.2.

## К. ЛЫШЧЫНСКІ – "БРЭСЦКІ МОНСТР"

***В.В. Судібор***

Навуковы кіраўнік – к.гіст.н., дацэнт ***А.Ц. Арбузаў***

*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*

У ліку ахвяр, прынесеных іншадумцамі на алтар разняволення людзей, стаіць і імя выдатнага беларускага мысліцеля Казіміра Лышчынскага. Трагічны лёс і пакутніцкая смерць Лышчынскага схіляюць да гераізацыі ягонай постаці. І, сапраўды, як філосаф і як чалавек, выказаў надзвычайную мужнасць думкі і сілу натуры. Лышчынскі, безумоўна, быў адораны талентам глыбокага пачування, учынкі яго вынікалі з перакананняў, ён прайшоў жыццё не па прамой, зведаў няпросты шлях ад шчырай веры ў бога да навуковага адмаўлення рэлігіі. У маладым узросце Лышчынскі шчыры каталік, потым жа сфармуляваў думкі, змест якіх значна шырэйшы за вузкія рамкі скарыстаных паняццяў: "Рэлігія ўстаноўлена людзьмі неверуючымі, каб ім аддавалі пашану, Страх божы ўнушаецца тым, хто не ведае божага страху, каб іх баяліся. Вера, якую лічаць святой, - выдумка. Вучэння, якое выхваляецца тым, што яно навучае ісціне пра бога, - пана!" Галоўная праца Казіміра Лышчынскага – трактат "Аб неіснаванні бога"- згарэў на агні разам з аўтарам; усе паперы, відаць, арыштаваныя інквізіцыяй, бясследна зніклі.

Казімір Лышчынскі нарадзіўся ў Лышчыцах, за 20 вёрст ад Брэста 4 сакавіка 1634 г. – па касцёльным каляндары ў дзень св. Казіміра. Заснавальнік роду Лышчынскіх – Леў – быццам бы паходзіў з Валыні і атрымаў Лышчыцы на прывілею на пачатку XVI стагоддзя. Ён меў трох сыноў – Канстанціна, Станіслава і Івана. У Канстанціна Львовіча нарадзіліся два сыны – Геранім і Лукаш. Геранім Лышчынскі даводзіўся бацькам аднаму з першых нашых атэістаў. Казімір з'явіўся на свет, калі бацьку было пяцьдзесят тры гады, калі паслалі яго ў Брэсцкую езуіцкую калегію, дык, відаць стары ўжо адлічваў сёмы дзесятак. Пасля калегіі Казімір Лышчынскі трапіў у войска – спачатку на казацкую вайну, потым змагаўся супраць шведаў і рускіх. У 26- ым узросце ён, як казалі раней, сыйшоў з каня і вярнуўся да вучобы. Чатыры гады вывучаў рыторыку, логіку, фізіку і метафізіку ў Калішы, пасля таго быў два гады настаўнікам у роднай брэсцкай калегіі езуітаў. Пакінуўшы ў 1666 годзе ордэн, Лышчынскі ажаніўся на Ядвісі Жаліхоўскай, атрымаў частку Лышчыцаў і заняўся сваім трактатам, Шматгадовы роздум і вынікі адкрыццяў занатаваў у рукапісе трактата: "Чалавек – стваральнік бога, а бог – стварэння чалавека. Такім чынам, людзі – творцы багоў."К.Лышчынскі па даносу сябра дзяцінства Яна Бжоскага, як выдатны беларускі мысліцель, якога біскупы празвалі "брэсцкім монстрам." 30 сакавіка 1689 года быў спалены ў Варшаве. Перастаўшы быць паслухмяным салдатам, сляпым фанатыкам, ён зрабіўся нетолькі не патрэбным Ватыкану, але і небяспечным для яго.